# Дыдактычны матэрыял для аўтаматызацыі гукаў [Р], [Л], [Ч], [Ж], [Ш], [С] у словах, сказах, вершах і тэкстах. Лічылкі, дражнілкі, скарагаворкі

## ЛІЧЫЛКІ

Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

Сядзіць немец на паліцы,
Лічыць дзеці на вуліцы:
Айн, цвай, драй –
Міша вылятай.

Сядзіць зайчык на прыпечку,
Лічыць дзяцей па-нямецку:
- Сьцяпан, Лявон,
Выйдзі вон.

Пярвеньныкі,
Другеньчыкі,
Кругі,
Другі,
Вон!

Пярвеньчыкі,
Бярвеньчыкі,
Я шышаў,
Ты выйшаў!

Семь семярэй,
І сямёра сьвіней.
Сьвінка і сьвінчын брат,
І сямёра парасят.

Бег сабака цераз мост,
Чатыры лапы пяты хвост.

Саломінка,
Яромінка
Прэла.
Гарэла,
На мора
Ляцела.
Касьцюк,
Масьцюк,
Радзівон,
Пайдзі вон.

Чыкі-чыкі-чыкарок,
Паня, Фёдар-Федарок.
Тлела, гарэла, замуж хацела

Цок-цыгірок,
Пана фіда-футарок.
Прэла, гарэла.
Вусь, барадусь,
Кіслы квас,
Лаві нас!

Бочка-грэчка,
Выкінь чалавечка.

Пятро, Пятро,
Падай вядро.
Карове піць,
Табе жмурыць.

Каціласся торба
Зь вялікага горба.
А ў той торбе
Хлеб, паляніца,
Зь кім ты хочаш
Падзяліцца?

Каціласся торба
З высокага горба,
У гэтай торбе
Хлеб і рыс,
З кім ты хочаш,
З тым дзяліся.

Эна, бэна, рэсь,
Кэнтар, мэнтар, жэсь,
Эна бэна, раба,
Кэнтар, мэнтар, жаба.

Э-ката, пэ-ката, мэ,
Абель, дабель, далінэ,
Ікі, пікі, гармацікі,
Клёнц, бонц, заёнц.

Эні-бэні, тры канторы,
Сахар, махар, паміноры,
Ас, бас, кіслы квас,
Выбірайся, чорт, ад нас.

Чыкеньчыкі. пікеньчыкі,
Ляцелі галубеньчыкі,
Чыкін, пікін,
Пальчык выкінь.

Ехала жаба на драбіне
І зьляцела прама ў сьвіні.
- Ой, ня ешце мяне, сьвіні,
Бо я ваша гаспадыня.

Жыў-быў цар,
У цара быў сад,
У саду быў пруд,
У пруду быў рак,
А хто слухае, той дурак.

Эні, бэні, тры капторы,
Мы спаймалі ў лесе вора,
Сталі думаць і гадаць,
Як нам вора пакараць.
Мы звязалі рукі, ногі
І пусцілі па дароге.
Хто ні едзе, хто ні ідзе,
Па капеечцы кладзе.
Нам капеечка не нада,
Зажмурыцца вору нада.

На стале ляжала міна,
Па-нямецку гаварыла:
- Энік, бэнік, шмык,
Выйдзі, маленькі мужык.

Ходзіць сьвіння па двару
І шукае лебяду,
А за сьвіннёй стары дзед,
Таму дзеду сорак лет.
Сорак, сорак, пяцьдзесят,
Выйшаў дзедушка-басяк.

Ехаў жаўнер з бальніцы,
Знайшоў белы рукавіцы.
Думаў, думаў, куды дзеці
Лепш на ручаньку надзеці.

Рэльсы гнуцца, рэльсы гнуцца,
Пад мастом паны дзяруцца,
Адзін маленькі панок
Удзірае без парток.
А назаўтра рыбакі
Прывязьлі яму парткі.
А ён дзякуй не сказаў,
Толькі дулю паказаў.

Апанас, Апанас!
Твая жонка у нас
Увалілась у квас
Лаві сем год нас!

Ішоў кот праз сто варот,
Дайшоў да канца,
Знайшоў кацяня.
Мяў!

- Круціцеся, жорны,
З'едзен хлеб наш чорны:
Крысін і Марысін,
Грунін і Анісів,
З'едзен і Пятроў хлябок.
Намялі для іх, дзядок.

Курыца-квактуха
Вадзіла дзяцей
Каля кляцей.
Квох - сесьці

На красным месці,
Яечка зьнесці.

- Заяц-месяц,
Дзе ты быў?
- У лесе.
- Што рабіў?
- Лыкі драў.
- Куды клаў?
- Пад калоду.
- Выйдзі вон із карагоду!

Эны-бэны, фіны, лёк,
Сам Пятровіч бліны пёк.
Пёк, пёк, не дапёк,
Схапіў шапку дый уцёк.

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсьць, сем, восем,
Выйшла баба з доўгім носам,
А за бабай сівы дзед,
Колькі дзеду таму лет?

Раз, два - рукава,
Тры, чатыры - нос у чарніле,
Пяць, шэсьць - кашу есьць,
Сем, восем - сена косім,

Раз, два - кружава,
Тры, чатры - пачапілі,
Пяць, шэсьць - кашу есьць
Сем, восем - сена косім,
Дзевяць, дзесяць - грошы
весіць.
Грош згубілі, два знайшлі -
У карчму ўсе пайшлі:
Чай п'юць, кубкі б'юць,
На стол грошыкі кладуць

Раз, два, тры, чатыры,
Мяне грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
Толькі поплясы скакаць.
Я скакала, я скакала,
Сабе ножаньку зламала.

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Выйшаў зайчык пагуляць,
А за зайцам шэры воўк,
Воўк у зайцах знае толк.

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсьць, сем, восем,
Мы, цябе, стукач, папросім.

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Шэсьць, сем, восем, дзевяць,
дзесяць,
Цар казаў мяне павесіць,
А нядоўга я вісеў:
Вецер дунуў - я зьляцеў.

Я сядзеў, чытаў газэту,
Нехта выпусьціў ракету.
Раз, два, тры -
Гэта, верна, будзеш ты.

Едзе брычка, званок звоне,
Выйшла пані лічыць коні:
- Раз, два, тры,
Выйдзі, малы, ты.

Стаяла машына,
Каля канторы,
Нумар дзявяты -
Выйдзі, пузаты.

Ані-бані, што пад намі,
Пад жалезнымі стаўпамі?
Сіта, пліта, квас,
Адыдзі, дурак, ад нас.

Нітачка, іголачка,
Ці-ці-ці,
Уляці.

Стакан, лімон,
Выйдзі вон!
Стакан вады,
Выйдзі ты!
Стакан заваркі,
Выйдзі без сваркі

Бегла курка па таку,
Па зялёным табаку,
Ела цукар і мядок,
Адчапіся, каралёк.

Хадзіў бусел па балоту,
Ён шукаў сабе работу .
Шукаў, шукаў, не знайшоў
І заплакаў дый пайшоў.

Ішоў Ціхан па масту,
Праваліўся ў ваду.
Бульк!

Чыкеньчыкі, пікеньчыкі,
Ляцелі галубеньчыкі.
Чыкін, пікін,
Пальчык выкінь.

Эні-бэні, лікі-факі,
Торба, горба, сеньцябракі,
Дэўс-дэўс, касмадэўс,
Бац!

Эны-бэны, дыкі-пакі,
Арба, торба, энцы, смакі,
Эвус, дэвус, каматэвус,
Старой бабе ў запек спаць.

Ішла кошка па раялі,
Наступіла на педалі
І запела: До, рэ, мі,
Фа,соль,ля,сі,
Што украла - прынясі.
- Я украла каўбасу,
Заўтра рана прынясу.

Ішла кукушка міма сеці,
А за ёй пішчалі дзеці.
Кук-мак, кук-мак,
Выбірай адзін кулак.
Ку-ку, ку-ку,
Прынімай адну руку.

Выйшла курыца з-пад сеці,
А за ёю - злыя дзеці.
Кох-кох, адзін здох.

Шла квактуха міма сеці,
Сама села на павеці.
Кох-кох-кох,
Адзін цыплёнак здох

Цынцы-брынцы, два кальца
Выстругалі малайца,
На сьвятой нядзельцы
Зьдзелалі кацельцы,
Кадельцы упалі,
На кузню сказалі.
Кузня божыцца: Не я,
Балалаечка мая.
Балалаечка-гудок,
Разваліўся мой дамок.

Ішоў баран па бару,
Ірваў капусту, лебяду.
Што сарве, то у пучок,
Выйдзі вон, дурачок.

Бег сабачка-галашыйка,
У яго борачка на шыйке.
То не борка - ланцужок,
Выйдзі, міленькі дружок.

Бег зай па бару,
Абіраў лебяду.
Рваў, клаў у пучок,
Выбірайся, ваўчок.

Чэрці ў возеры купаліс,
Чэрці рожкамі штурхаліс,
Чорт чарцёнка штурхануў
І чарцёнак патануў.

А ты, коцік, не гуляй,
Начовачкі прыбірай!
Начовачкі ськлізкі,
Вядзёрачкі блізкі.
Круг абарваўся,
А ты так астаўся.

Тарана,тарана,
Купіў бацька барана,
Да не скобленага,
Да не доенага.
Матка даіла,
Даёнку пабіла.

- Хто не ўмеець гараць,
Таму хлеба не даць,
Ні капусты, ні бацьвінні
Хай пасець у полі сьвінні.
Яму сьвінні дакучылі,
Хутка гараць навучылі.

Беглі коні пад мастамі
З залатымі капытамі.
Дзінь-бразь,
Выйдзі, князь!

Сава, соўка,
Маладая ўдоўка,
Сядзіць на цавеці,
Люба паглядзеці:
Сама шэранькая,
Дзюбка доўгенькая.
Дзінь-бразь,
Выйдзі, князь,
Не забудзь дзіця.

**ДРАЖНІЛКІ**

-Мі-кі-та! Ці ты та?
- Не я то, мой та-та.
Мікіціха дзяжу месіць,
А Мікіта сьпіну чэшыць.
Мікіта дровы сячэць,
А Мікіціха бліны пячэць.
Сячэць дровы яловыя,
Пячэць бліны паловыя.

Натальля - пральля,
Кузьма - верацяеньнік.
Пайшоў у бярэзьнік,
Сабакі дагналі,
Нагу адарвалі.

Дзілінь-дзілінь-баў!
Саўка прапаў!
Палажылі Саўку
На белую лаўку.
Лаўка трасецца.
Саўка сьмяецца.
Курачка сакоча -
Савачка рагоча.
Дзілінь-дзілінь-баў!
Саўка прапаў!

Віця, Віця, Віцяля,
З'еў карову і цяля.
І дванаццаць парасят
Толькі хвосцікі вісяць.

Сяргей-верабей
На кані катаўся,
Рукі, ногі паламаў,
Без штаноў застаўся.

Сьветка-катлетка,
Длінная шкарпэтка.

Франак - абаранак.

Людзік - пудзік.

Юзік скруціўся ў гузік.

Андрэй не дурэй,
Не дзяры капоты!
Не ты ткаў,
Не ты праў
Не твае работы!

Сікша моча падай клочча,
- Нашто клочча?
- Пугу віць!
- Нашто пуга?
- Сікшу біць

Коцік мяўкнуў,
Выгнуў сьпінку,
Хвост падняў як корбу
І ў тую жа хвілінку
Шусь яго ў торбу!

# Аўтаматызацыя гука [с]

## Паслухай і паўтары

1. Прамыя склады і словы з імі:

Са - со - су - сы, со - су - сы - са, су – сы - са - со, сы - са - со - су.

Сад, сані, самакат, самалёт, сын, сок, сода, сад, сон, сом, Соня, суп, сумка, субота, сухі, аса, каса, вусы, пясок, посуд, сотня, мяса.

2. Адваротныя склады і словы з імі:

Ас – ос – ус – ыс, ос – ус – ыс – ас, ус – ыс – ас – ос, ыс –ас – ос – ус.

Фокус, кактус, вус, подпіс, лес, нос, насос, какос, авёс, матрос, паднос, аўтобус, ананас, Дзяніс.

3. Складавы рады са збегам зычных:

| | |
|---|---|
| Ста – сто - сту- сты | аст – ост –уст - ыст |
| Кса – ксо – ксу- ксы | аск – оск – уск - ыск |
| Ска – ско – ску – скы | акс – окс – укс – ыкс |
| Спа – спо –спу - спы | асп – осп – усп – ысп |
| Сма – смо - сму- смы | асм – осм – усм – ысм |
| Сна – сно – сну – сны | асн – осн – усн - ысн |
| Пса – псо – псу – псы | апс – опс – упс – ыпс |

4. Словы са збегам зычных:

Статак, стадыён, скокі, слон, святлафор, спадарожнік, сваяк, студзень, студэнт, стол, стул, свабода, спакой, смак, капуста, месца, пусты, Мінск, схаваны, усход, небяспечны, поспех, мост, хвост, хакеіст, баяніст, куст.

5. Аўтаматызацыя гука С у словазлучэннях:

Высокая сасна, сталёвы насос, пасажыры аўтобуса, склад слова, сасновы лес, пасадка сосен, спуск самазвала, пусты посуд, касманаўт у космасе, саліст ансамбля, салодкая слойка.

Чыстагаворкі, скорагаворкі

Сорак сарок – сорак марок.

На какосы, на какосы  наляцелі мы як восы.

Сонца-сонейка, свяці цёпленька.

Са-са-са – вось бяжыць ліса,
Су-су-су – убачылі лісу,
Сы-сы-сы – не баюся я асы,
Сі-сі-сі – у рацэ карасі.

Ас – ас –ас – пойдзем усе да нас,
Ос–ос–ос – на палубе матрос,
Усь –усь –усь – з вады выйшла гусь,
Ысь-ысь-ысь – у засадзе рысь.

6. Аўтаматызацыя гука С у сказах:

Сабака есць з міскі. Аўтобус прыпыніўся каля моста. Самалёт ляціць над лесам. Ліса спалохалася сабакі. Саліст праспяваў песню. У сома вусы. У Соні касынка ў палоску. Сёму купяць новы самакат. Салома сохне на сонцы. Самалёт ідзе на пасадку. У Сімы русыя косы. Барыса пакусаў сабака. У садзе сухі пясок. Соня пасаліла суп з мясам. У нас пагасла святло. Слава п’е квас. У садзе растуць астры. У місцы капуста. Ластаўку лётаюць высока ў нябёсах. Беражы нос у мароз[с]. У місцы кіслыя брусніцы. Сабака спіць пад кустом.

**Загадкі**

Яно па небе плавае,
Іскрыстае, рухавае,
Жыццё дае палеткам
І збажыне, і кветкам.
(Сонца)

Маю рогі, маю ногі,
Я багаты і ўбогі,
Ля мяне ўсе сядаюць,
Дык скажы, як называюць.
(Стол)

Гудзе, як пчала, ляціць, як страла,
Крыламі не махае, хто адгадае? (Самалёт)
На двары - гарою, а ў хаце – вадою. (Снег)
З вады нарадзіўся і ў ваду ператварыўся. (Снег)
Белы, а не цукар. Ног няма, а ідзе. (Снег)
Я засяваю дол ігліцай,
Спрадвеку слаўлюся жывіцай. (Сасна)

**Прыказкі, прымаўкі**

Слова сказаў – сякерою адсёк.

Сказанага слова ніхто за хвост не зловіць.

Сказана – звязана.

Сон на заўтра адлажы, а справу сёння зрабі.

Сакавік часам снегам сее, а часам сонцам грэе.

Смачна было, ды бліз[с]ка дно.

Усякаму сваё баліць.

Касі каса пакуль раса.

Якая справа – такая и слава.

Скоры паспех людзям на смех.

Сам не ўмееш слухаць – другога не прымусіш.

**Вершы**

САВА І САВА

Прыйшоў Сава ў лес,
На яліну ўлез,
Падняў галаву,
Убачыў саву.

- Ты скажы, сава, -
Пытаецца Сава,
А твая дзятва
Ведае забавы?..

Лянівы санліваму кажа: – Не позна!
Санлівы лянiваму кажа: – Марозна!
Лянівы санліваму: – Дзе мае ноты?
Санлівы лянiваму: – Эй, ты, лянота!
Санлівы – лянівы, лянівы – санлівы!

У асы не вусы, а вусікі.

У маленькай Сані сані едуць самі.

С – як серп ці маладзік, што на сінім небе ўзнік.

Спіць спакойна стары сом,
Бачыць ён салодкі сон.

Сустракаць бягуць вясну сінія пралескі.

Пайшоў Сёма лавіць сома,
Соня спіць спакойна дома.
Соні – сон, Сёму – сом.

Галавой ківае слон

Ён сланісе шле паклон.

Сонейка, сонейка, асвяці сасоннікі.

## Паслухай, падумай

Салата, сок, сад, суп, смецце, сухар, сыр, сырок, сом, сон, сасіскі, самалёт. *Што з гэтага можна есці, а што нельга?*

Ананас, нос, вус, лес, квас, голас. *Што з гэтага можа расці?*

Аса, каса, ліса, сом, сава, валасы, посуд, салома, сэрца. *Што тут жывое? Што нежывое? Хто можа лётаць?*

Статак, стол, крэсла, спадарожнік, сосны, слон, слівы, смятана, слоік, гусь, сад, лось.

*Што з гэтага можа быць у людзей у хаце?*

Сава, сліва, самалёт, санкі, карась, таксі, снягір, свіння, спіна, самазвал, слёзы, самакат.

*Хто можа рухацца? Што самастойна рухацца не можа?*

## Паслухай, перакажы

ВОСЬ ДЫК СВІСНУЎ

Нехта прынёс Сяргейку свісток. Носіць яго з таго часу Сяргейка заўсёды з сабою і ўсё свішча ды свішча.

Аднойчы Сяргейка так свіснуў каля самага вуха ката Ваські! Спалохаўся Васька і скокнуў на стол. А там міска са смятанай. І вось міска пустая, а ўвесь стол і Васька ў смятане.

ПАДАРУНАК СЫНУ.

Маці падаравала сыну маленькага сабачку. Вельмі ўзрадаваўся Саня падарунку і адразу назваў сабачку Сімкам. Вось пачаў Сімка знаёміцца з пакоямі. Спачатку абнюхаў маміну сумку. Потым залезл пад стол і стаў грызці ножку крэсла.

“Сімка, нельга!” – закрычаў Саня і палез за сабачкам пад стол. Але Сімка выскачыў адтуль, пабег у калідор і хацеў схавацца за самакат. Тут Саня злавіў сабачку і сказаў: “Не бойся, Сімка. Я цябе біць не буду.”

Соня і Саня ў садзе. Там шмат кустоў і сасна. Растуць таксама слівы. Саня частуе Соню слівамі. На абед у Сані і Соні суп з мясам, капуста пад соусам, ананасавы сок і слівы. Смачны абед у Соні і Сані.

**Паслухай, адкажы**

Саня ідзе ў сад. *Хто? Куды?*

У садзе восы? *Хто? Дзе?*

Сава спіць. *Хто? Што робіць?*

## Утвары прыметнікі

| | | |
|---|---|---|
| Лес – лясны, | сад – садовы | посуд – пасудны |
| Аўтобус – аўтобусны | сон – сонны | мяса – мясны |
| Месца – мясцовы | ананас – ананасавы | вус – вусаты |
| Сасна – сасновы | какос – какосавы | смак – смачны |

**Складзіце сказы са слоў**

Сёма, пасвілі, і, статак, Соня.

Сіма, суп, з, есць, мясам.

Сок, піў, ананасавы, Сева.

Саня, сумцы, у, ананас, нясе.

# Аўтаматызацыя гука [ш].

**Чыстагаворкі**

Ша-ша-ша мыю малыша,
Шу-шу-шу – ваду нашу.
Шы-шы-шы малога калышы.

Аш-аш-аш – у лесе ёсць шалаш,
Уш-уш-уш – мы купілі груш,
Ыш-ыш-ыш – кот злавіў мыш.

Аўтаматызацыя гука Ш у словазлучэннях, сказах

1. Наша школа, швейная машынка, шаўковы шалік, Дашына шапка, шамацяць мышаняты, пшанічная каша, шыццё шынялю, наш душ, шыпы шыпшыны, Наташыны галёшы, у машыны шыны, пшонная каша, пушыстая шапка.

Згатавала Даша кашу для Машы.

Маша Дашы ўдзячная – каша ў Дашы смачная.

2.Праспрагайце разам са мной:

Я мяшаю пшонную кашу. Ты мяшаеш пшонную кашу і г.д.

Я шыю на швейнай машынцы. Ты шыеш на швейнай машынцы і г.д.

3. Паўтарыце за мной сказы.

Лёша пайшоў у школу. Даша шые на швейнай машынцы.

Сашава шапка ўпала пад вешалку. Наташа і Маша знайшлі ландышы.

Паша знайшоў шампіньёны. Мішка знайшоў шышку.

Яшу купілі шашкі і шахматы. Нюша і Глаша елі кашу.

Наша Маша на шашы. На шашы машыны.

**Загадкі**

Стаіць пястунчык –

За кожны глытунчык

Просіць пацалунчык. (Шклянка)

Туды – рог, сюды – рог,
Пасярод – нібы пірог,
А сама набіта пухам
І ў мяне ляжыць пад вухам. (Падушка)

Маленькі шарык пад лаўкаю шарыць,
Збірае крошкі, баіцца кошкі. (Мыш)

Што за вішні
На шыі павіслі? (Пацеркі)
Ледзь вясна шчэ наступае –
Ён канцэрты пачынае.
Гучна льецца песня – свіст…
Як завецца той артыст? (Шпак)
Штоночы дарожка з залатога гарошку. (Млечны шлях)

**Прыказкі, прымаўкі**
Шыла ў мяшку не схаваеш.
Не шукаючы не знойдзеш.
З шыла не зробіш мыла.
Шануй людзей, то і цябе пашануюць

**Скорагаворкі**
Шылам Мушка шыла вушка.
Шэсць мышанят у шалашы шамацяць.
Сашы далі кашы, а Машы сыраквашы.

НА ШАШЫ
Штохвіліны на шашы
Шумна, як на кірмашы.
Шоргат,
За машынаю машына.
Нешта шэпча шына шыне…
Шэпча шустрая шаша:

Шорах,
Шум птушыны.

- Не спяшайцеся,
Ша-ша…

ШПАЧОК

Пайшоў шпак на шпацыроўку,
Знайшоў хустку-кашміроўку,
А шпачыха завязала
І нічога не сказала.

Пайшоў шпак на шашу,
Знайшоў шапку малышу.
- Харошая шапка.
Дзякуй табе, татка.

Сенам шапаткім у шалашы,
Мышка шустрая, уночы не шуршы.

У вавёркі ў катушку
Кожны ў шчыльным кажушку,
Сто арэшкаў спелых, шэрых –
На вавёрчыны вячэры.

У машыны – шыны,
А шыпы ў шыпшыны.

**Паслухай, падумай**

*Што з пачутага можа само рухацца?*

Шына, машына, мышы, шыпшына, кошык, шыла, шыя, ландышы, вушы, шыншыла, шапка.

*Што з гэтых рэчаў адносіцца да вопраткі?*

Шапка, шашкі, шахматы, шалік, шампунь, шарык, шорты, машына, шахта.

*Да якіх слоў можна паставіць пытанне хто? (жывое), да якіх што?(нежывое)*

Шалаш, Паша, душ, Наташа, швяя, кулеш, шнурок, мышка, плюшавы мішка, падэшва, школьнік.

**Палічы**

Тата і мама купілі Пашу па шэсць шарыкаў. Тры шарыкі ў Пашы лопнулі, а тры паляцелі. Колькі ў Пашы засталося шарыкаў?

**Паслухай, адкажы**

Мышаня знайшло дзірку ў мяшку і ўцякло ад кошкі. *Хто? Што зрабіла? Дзе? Ад каго?*

Швяя Даша шые на швейнай машынцы шаўковы шалік. *Хто? Што робіць? На чым? Што шые? Які шалік?*

**Паслухай і перакажы**

ДАШЫН ПУШОК.

Быў у Дашы кот Пушок. Пайшла Даша ў школу, а Пушок яе дома чакаў. Прыйшла Даша дадому і ахнула! На падлозе валяўся шаўковы шалік, бацькава шапка-вушанка. А матуліны шлёпанцы ляжалі ў яе капелюшы на шафе! Кот-свавольнік сядзеў пад вешалкай і варушыў вушамі.

# Аўтаматызацыя гука [ж].

**Чыстагаворкі**

Жа-жа-жа – злавілі вужа,

Жу-жу-жу – на траве ляжу,

Жы-жы-жы – у вадзе плаваюць маржы,

Жо-жо-жо – мы выраслі ўжо.

**Загадкі**

Бягуць па дарожцы дошкі ды ножкі. (Лыжы)

Іголкі мае, а шыць не ўмее. (Вожык)

Пад хвоямі, пад смолкамі па лясных дарожках

Бяжыць клубок з іголкамі на кароткіх ножках. (Вожык)

З выраю першы вяртаецца.

З песняй да свету звяртаецца.

Поля і неба сябрук,

Гэта, вядома, … (жаўрук)

Чоран, ды не воран,

Рагаты, ды не бык.

Шэсць ног без капыт.

Ляціць – вые,

Сядзе - зямлю рые. (Жук)

Маленькі галышык

Упаў з вышак,

Бацька радасна люляе

сотні дзетак на руках.

Не так разбіўся,

Як шапачку забыўся.

(Жолуд)

Шапка ў бацькі лісцяная,

Дзеткі - усе ў капелюшах.

(Дуб, жалуды)

Ложа мае, ды ў ім не ляжыць:

Усё бяжыць і бяжыць. (Рака)

Зімой даліны і сцяжынкі

Пакрылі белыя (сняжынкі).

**Прыказкі, прымаўкі**

Дружба дружбаю, а служба службаю.

Прыгожаму ўсё гожа.

Не зважай на ўраджай, а жыта сей.

Добра працуеш – Радзіму мацуеш.

Сем разоў адмер, адзін адрэж.

**Скорагаворкі**

Колькі ножак, столькі ж рук,

Ж – нібы вялікі жук.

Згубіш Ж і слоў прыгожых

Прачытаць ніяк не зможаш:

Журавель, жыццё, жаўрук. (А. Вольскі)

Сорак ножак у сараканожак.

Рухаюцца ножкі – паўзуць сараканожкі.

Жняцы на ніве – жне жыта жнівень.

Вожык- маці, вожык- тата

І малыя важаняткі

Кніжкі ўважліва чытаюць

Спрытны, жвавы вожык-зух

сябруку пашыў кажух.

Пад алешынай ля хаткі.

**Паслухай, падумай**

*Да якіх слоў можна паставіць пытанні хто? да якіх што?*

Жаба, жыта, жук, вужы, нажы, піжама, лыжы, піражок, ляжанка, жаўрук, вожык.

*Якія з гэтых слоў называюць жывёл?*

Ажыны, жырафа, жарабя, жаўток, марожанае, жэле, журавель, маржы, вужы, стрыжы, гаражы, жужаль, лыжнік, жолуд.

**Палічы**

У школьным жывым кутку жылі тры вожыкі і два вужы. Потым у жывым кутку пасяліліся журавель і тры жабы. Аднаго вожыка і аднаго вужа падаравалі дзіцячаму саду. Колькі жывёл засталося ў школьным жывым кутку?

Жанна і Жэня знайшлі каля дуба жалуды. Жанна знайшла дзевяць жалудоў, а Жэня - пяць. Жанна аддала Жэню два жалуды. Потым Жэня знайшоў яшчэ шэсць жалудоў і падзяліўся з Жаннай. У іх стала пароўну жалудоў. Колькі жалудоў стала ў Жанны і Жэні?

**Паслухай, адкажы**

Жора і Жэня лізалі марожанае на пляжы. *Хто? Што рабілі?Дзе?*

Жанна і Міша ішлі па лесе. Яны ўбачылі вожыка. Вожык скруціўся клубком. *Хто? Што рабілі? Дзе? Убачылі каго? Што зрабіў?*

ЖЭНЯ І ВОЖЫК

У Жэні жыве вожык. Удзень вожык чакае цемры пад кніжнай шафай. Жэня кожны дзень рыхтуе ежу для свайго калючага шарыка. Каб вожык паеў, неабходна выманіць яго з-пад шафы.

ЖЭНЯ ПАМЫЛІЎСЯ

– Напішы, Жэня, што робяць жывёлы: вожык, журавель, вужы, жаба. Жэня ўсміхнуўся і напісаў. Вось што ў яго атрымалася. Вужы лётаюць у небе. Вожык лазіць па дрэвах. Журавель поўзае па зямлі. Жабы палююць на мышэй.

Жэня, вядома, пажартаваў і наўмысна зрабіў памылкі. Выпраўце іх.

ХІТРЫ ЖОРА.

– Жора, пабеглі навыперадкі. Хто першы дабяжыць да гаража і вернецца назад? Фініш будзе тут, каля школы.

– Той, хто першым дабяжыць да школы, будзе пераможцам?

– Вядома.

– Тады навошта бегчы да гаража? Я цябе лепей тут, каля школы, пачакаю.

# Аўтаматызацыя гука [ч]

**Чыстагаворкі**

А чу-чу, чу-чу, чу-чу,

Я гарох малачу

На чужым тачку

На прыгорачку.

Ча-ча- ча – злавілі ляшча,

Чу-чу-чу – да месяца лячу,

Чы-чы-чы – сядзім на пячы.

Чо-чо-чо – возьмем на плячо.

Ач-ач-ач – ніколі не плач,

Оч-оч-оч – цёмная навокал ноч.

## Паслухай, паўтары, падумай

1. 1. Урач, ткач, ключ, мяч, печ, ноч, абруч, меч, рэч

*З якім рэчамі з пералічаных можна гуляць?*

2. 2. Дачка, печка, ячмень, булачка, ручка, пчала, кручок, рэчка, павучок, авечка, лётчык, грэчка, чытанка, унучка.

*Якія словы называюць жывое? Якія – нежывое?*

3. 3. Чаромха, чайнік, чарапаха, качка, качан, дача, задача,чарэшня, чарніцы, чалавек, чыгунок, чуб, вечар, вучань.

*Што тут можа само рухацца? Якія з гэтых слоў абазначаюць ягады? Якія з гэтых слоў абазначаюць назвы посуду?*

4. 4. *Якія з гэтых слоў азначаюць маленькія прадметы?*

Вучаніца, пальчык, мячык, дачка, пячэнне, ручаёк, бычок, чарніцы, крынічка, хлопчык, рэчка, урач, пячонка, жучок, пчала, ключык, чайка, вудачка.

**Паслухай, адкажы на пытанні**

Ніначка наглядае за сястрычкай Волечкай. Яна калыша каляску Волечкі, каб дзяўчынка не крычала. “Малайчына, дачушка”, - гаворыць тата. – Маме дапамагчы – твой абавязак”. *Хто? Што робіць? Чыю каляску? Навошта? Што гаворыць?*

У Танечкі тата і мама ўрачы. Яны лечаць хворых. Танечка таксама хоча стаць урачом. А пакуль што Танечка лечыць сваіх лялек. *У каго? Хто тата і мама? Што робяць? Хто? Кім стаць? Што робіць? Каго ?*

**Паслухай і перакажы**

КРОПЛЯ Ў МОРЫ

Хто плача? Маленькія дзяўчынкі і хлопчыкі. Плачуць дрэвы аб дажджы, які прайшоў. Але ведаеш, хто больш за ўсіх плача? Марская чарапаха. Аднойчы злавілі мы такую чарапаху. Яна была вялікай-вялікай. Не чарапаха, а сапраўдная хатка на нязграбных лапах. Пасадзілі мы гэтую чарапаху на палубу. А яна раптам пачала плакаць. Раніцай плача, вечарам плача і ў абед таксама кап-кап… Закацілася сонейка ў мора – чарапаха плача. Ёй сонейка шкада. Пагаслі зоркі – зноў плача. Шкада ёй зорачак.

Нам таксама стала шкада чарапаху. Мы адпусцілі яе ў сіняе мора. Потым даведаліся: абдурыла нас чарапаха… Нічога ёй не было шкада. Плачуць чарапахі таму, што жывуць у моры. Вада ў моры салёная. Лішнюю соль з вады чарапахі і выплакваюць.

**Загадкі**

Прыйшла чорная маці, усіх паклала спаці. (Ноч)

Прыйшла чорна карова, усіх людзей пабарола. (Ноч)

Брат з браткам цераз дарогу жывуць,
Адзін аднаго не бачаць. (Вочы)

Кругленькія, гарбаценькія,
Па краях – лахмаценькія.
Як прыйдзе бяда –
Цячэ з іх вада.
(Вочы)

Болей б'ём – ён болей скача,
Не сярдуе і не плача.
Моцна ўдарыш – не дагоніш,
А ў вадзе з ім не патонеш.
(Мяч)

Не можа ні стаяць і ні легчы,
А ўвесь час хоча бегчы.
(Ручай)

У яго ў начы
Вачэй тысячы.
(Неба)

**Прадукты, садавіна, гародніна**

Выспеў на градзе белы чарадзей:
Галава – на славу, да зубка зубок,
Добрая прыправа, а завуць …(Часнок)

Гудзе, ды не самалёт.
Можа раніць, ды не страла.
Хто адгадае, хто гэта? (Пчала)

Растуць у лесе сястрычкі – рыжыя... (Лісічкі )

Без калёс, а едзе. (Човен)

Еду, еду – ні дарогі, ні следу. (Човен)

**Скорагаворкі**

Шубка ў авечкі цяплейшая за печку.

У чаплі - чапляня, у зайкі – зайчаня.

Пчолка з чмелем у чоўніку плылі.

Чатыры чорныя гракі крычалі гучна ля ракі.

Чатыры чорных чарцяняці чарцілі чорным чарнілам чарцёж.

*Чапяла і чапля*

Чапяла з хаты ўцякла, раскрычалася,
Чапяла да чаплі чаплялася:
-Чаму, чапля, ногі доўгія маеш?
-Чаму, чапля па балоце блукаеш?

Тачу, тачу, абточваю,
Начыста заточваю,
Канцы з канцамі сточваю.
Калі што недаточана,
А можа ператочана,
За точку пераплочана, -
Хутчэй, хутчэй даточвайце,
І не пераплочвайце.

# Аўтаматызацыя гука [л]

## Словы для аўтаматызацыі

1. Авал, канал, метал, падвал, баскетбол, стол, дзяцел, попел, навасёл, вакзал, пенал, футбол, самазвал, асёл, казёл, вузел, касцёл, Павел.

2. Заколка, галка, вулкан, балкон, палка, халва, тлусты, булка, пасылка, салдат, мяцёлка, Волга, насілкі, алфавіт, гальштук, фіялка, калготы, бутэлька.

3. Ла, ло, лу, лы. Лак, ластаўка, піла, салата, палатка, лаўка, лапаць, латка, акула, халат, лама, ласка, лавіна, кулак, булаўка, лавішкі, малако, лаза, золата, холад, голад, валасы, галасы, галава, малахіт.

Лом, лоб, далоні, калона, салонка, палоць, палова, локаць, лось, лотаць, балонка, калонка, халодны, салома,

Лыжы, лыжнік, палын, лыжня, лысы, калыска, спелы, белы, мілы, канікулы.

Луг, лупа, Лука, лунацік, валун, Калуга, галубка, галубы, галубок, жалуды.

4. Кла, кло, клу, клы. Зла, зло, злу, злы. Гла, гло, глу, глы.

Пла, пло, плу, плы. Бла, бло, блу, блы. Фла, фло, флу, флы.

Хла, хло, хлу, хлы. Сла, сло, слу, слы.

(Мяняецца парадак складоў не менш за 4 разы)

Клава, клас, клоўн, класны, клубок, клумба, паклон, скланенне, клавіятура, клуб, іклы, вокладка, складаць, пекла, шкло, класці.

Гладкі, глобус, глыток, глыбіня, глытаць, глыбокі, глухі, гладыёлус, глотка, глупства, гладыш, глушэц.

Блакнот, бландзін, блыха, аблокі, яблык, блузка, блакада, блытаніна, блакіт.

Плысці, плоў, плод, плакат, пластылін, плот, плошча, плывец.

Слава, слойка, слон, вясло, слых, масла, сланечнік, слабы, слухач, слуп, слоўнік, слодыч.

Фламінга, флот, хлопец, хлапечы, хлус, хлусня.

5. Акл, окл, укл, ыкл. Алк, олк, улк, ылк. Асл, осл, усл, ысл.

Алс, олс, улс, ылс. Апл, опл, цпл, ыпл. Алп, олп, улп, ылп.

Афл, офл, уфл, ыфл. Аох, олх, улх, ылх.

6. Аўтаматызацыя гука Л у сказах:

На балконе лопнула шкло.
Эла зламала лыжную палку.
Святлана слухала салаўя.
Павел заблукаў у глухім лесе.
Святлана ўсміхнулася вясёлцы.
Шкляная бутэлька лопнула ад холаду.
Ала закалола валасы залатой заколкай.
Клава палола гладыёлусы на клумбе.
Ала ела булку з маслам.
Клава плавала з аквалангам.
Міла ўкалолася булаўкай.
Валодзя складаў халаты.

**Загадкі**

На агні не гарыць, у вадзе не тоне. (Лядзяш, лёд)

Што зімою камлём уверх расце? (Лядзяш)

Расце ён зімою
Уніз галавою,
Камлём дагары
І расце да пары:
Як стане грэць сонца –
Ён плача бясконца,
Сыходзіць слязамі
І ўвесь прападае.
Падумайце самі:
Мо хто адгадае? (Лядзяш)

Сябры, пабраўшыся за рукі,
Вядуць усіх нас да навукі.
Яны – у кнізе, у газеце,
І іх павінны ведаць дзеці.
(Літары)

Вісіць – зялёны,
Ляціць – жоўты,
Ляжыць – чорны. (Ліст)

Ляжыць паленца, а ў сярэдзіне – сэрца. (Аловак)

У гаі –гаёчку
Між травы – расы
Белыя званочкі
Спрабуюць галасы.
(Ландыш)

Сінявокі, слаўны, чысты,
Галавасты, залацісты,
Дасць абноў ён людзям шмат,
Будзе кожны вельмі рад.
(Лён)

Што за гаспадыня ходзіць каля гаю?

Залатое футра па зямлі цягае. (Ліса)

Жыву я ў кожнай хаце,
Удзень я мала варты,
А нанач усім людзям
Патрэбны я не жарты. (Ложак)

У лесе жыве, харчуецца,
На галаве дрэва красуецца. (Лось)

Шпількі, іголкі - не злічыш колькі. (Яліна)

Дапаможа есці ўсім,
А сама - не есць зусім. (Лыжка)

**Прыказкі і прымаўкі**

Далей паложыш – бліжэй возьмеш.

Была б галава на плячах!

З адкладу няма ладу.

**Скорагаворкі, чыстагаворкі**

Ла-ла-ла – на кветцы пчала,
Лы-лы-лы – не баюся пчалы,
Ло-ло-ло – на вуліцы святло,
Лу-лу-лу – цацкі ў вуглу,
Лю-лю-лю – маму я люблю,

Лі-лі-лі – кашу пасалі,
Ле-ле-ле – посуд на стале.
Ол-ол-ол – сядаем за стол,
Оль-оль-оль – мы купілі соль,
Ель-ель-ель – дзеці п’юць кісель.

Лянок не любіць лянот. Лянот не любіць лянок.

Ліска лашчыць лісяня,
а ласіха – ласяня.
Леў ласкава лапаю
ільвяня паляпвае.

- Ці маліну мылі вы?
- Мылі, ды не вымылі.

Міла шукала булаўку.
Булаўка ўпала пад лаўку.

ЛІСКА І ЛЫСКА

Каля лесу бегла
Ліска,
А насустрач Лісцы
Лыска.
Папрасіла Ліска
Лыску:
-Палюляй, сусед, калыску,

Але Лыска
Ані блізка:
- Не люляў я
Лысянятак,
Што ж люляць мне
Лісянятак?

Каласы каласавалі, каласавалі, выкаласаваліся.

Лілечка лялечку Алачку любіць, яе забаўляе.

Лілечка лялечку Алачку ў люльцы люляе.

Піліп да ліпы прыліп. Да ліпы прыліп Піліп.

Галубыя галубы гулялі ў галубятні.

Зачаруюць светла летам нас фіялкі фіялетам.

Лета, ліпень, лінуў лівень.

Пахнуць ліпы і маліны.

Расцвілі ў бабулі Лёксы
Гладыёлусы і флёксы.

Пакланюся на палянцы
Я рамонку і фіялцы.

## Аўтаматызацыя гука [р]

Аўтаматызацыя гука Р у адкрытых складах і словах:

Ра-ро-ры-ру-рэ рэ-ро-ру-ра-ры ро-ра-рэ-ры-ру

Ру-ры-рэ-ро-ра ры-ру-рэра-ро (Паўтарыць не меней чатырох разоў)

Рама, радасць, радыё, Радзіма, рака, рак, раса, раскоша, расліна, ражок, распаліць, растлумачыць, распісаць, расказаць, раздаць, разабраць, рабіна, чарапаха, мора, берагі, карона, ракета, пара, макарона, рамонак, мурашка

Рогі, рогат, розны, розум, роля, розніца, сарока, варона, робат, Сярожа, бяроза, арол, урок

Рука, руды, ружа, русак, рух, ручаёк, ручка, ручнік, рухацца, варушыцца

Рэха, рэчка, рэчы, рэмень, рэшата, рэдзька, рэйка, арэхі

Рыба, рыбак, рыбалка, рыбалоў, рыбіна, рысь, рыкаць,рыхтаваць, мандарын, фары

Аўтаматызацыя гука Р у складах і словах са збегам зычных:

Бра–бры-бро-брэ–бру, бру- бро-бра–бры- брэ, брэ–бра-бру-бры-бро, бры-бро-бру-бра-брэ

Гра-гро-грыг-ру-грэ, грэ-гру-гро-гры-гра, гры-грэ-гра-гру-гро, гро-гры-грэ-гры-гру

Пра-про-пры-прэ-пру, пры-пру-про-пра-прэ, про-прэ-пру-пры-пра, про-пра-пру-прэ-пры

Тры-тра-тро-тру-трэ, тра-трэ-ту-тро-тры, трэ-тры-тро-тра-тру, тро-тру-тры-трэ-тра

Дры-дро-дрэ-дру-дра, дро-дра-дры-дру-дрэ, дрэ-дра-дру-дры-дро, дрэ-дро-дру-дра-дры

Вра-вро-вру-врэ-вры, вро-вры-врэ-вру-вра, вры-врэ-вро-вра-вру, вру-вра-вры-вро-врэ

Грузавік, пятрушка, крот, дрэва, дровы, дабранач, дробны, кроў, тактар, трава, тройка, трэці, транспарт, грошы, грушы, гром, грыміць, крыло, кран, матрошка, грабеньчык, кропля, бруква, трамвай, прыгожы, коўдра, страказа, грызе, кручок,круг, трохвугольнік, бразготкі, крэсла, крэйда, вершы, правіла, праўда, брусніцы, сястрыца

Аўтаматызацыя гука Р у адваротных складах і словах:

Ар-ор-ур-ір-эр, ір-эр-ар-ор-ур, ор-эр-ур-ар-ір, ор-эр-ур-ір-ар, ір-эр-ур-ор-ар, эр-ір-ур-ар-ор

Арк-орк-урк-эрк-ірк, ырк-урк-эр-орк-арк, орк-арк-ірк-эрк-урк, эрк-ірк-арк-урк-орк

Кефір, манастыр, цукар, тыгр, морква, абажур, марка, цэбар, катэр, памідор, мухамор, сыр, зефір, святлафор, матор, буквар, пухір, якар, сухар, камар, бабёр, сябар, заапарк, зорка, тырчыць, позірк, дзірка, арліца, горка, Рыгорка

**Чыстагаворкі**

Ра-ра - ра – пад сасной нара,

Ро-ро-ро – у Мінску ёсць метро,

ру - ру- ру - заяц грыз кару,

ры-ры-ры- гудзелі камары,

ыр-ыр- ыр – з’елі ўвесь сыр,

ір-ір-ір – выпілі кефір,

ор-ор-ор – чырвоны памідор,

ур-ур- ур - прыгожы абажур.

**Загадкі**

Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць (Гром)

Вечарам нараджаецца, а раніцай памірае. (Раса)

Зімой хаваюся, увесну з’яўляюся,

Летам весялюся, увосень спаць кладуся. (Рака)

Жыве без цела, гаворыць без языка,

Ніхто не бачыць, а толькі чуе. (Рэха)

Аўсом не кормяць,

Пугай не гоняць,

А як араць пачне –

Сем плугоў цягне. (Трактар)

У лужку - лужочку

Выраслі сястрычкі:
Залатое вочка.
Белыя раснічкі. (Рамонкі)

Не рыба, а плыве.
Не конь, а ідзе.
Не піла, а рэжа. (Бабёр)

Раніцу кожную лашчыць, сушыць
Шыю, рукі, твар і вушы. (Ручнік)
Ва ўсіх дзетак адзенне з манетак. (Рыба)

**Прыказкі, прымаўкі**

На вярбе грушы не растуць.
Рыбка ў рацэ, ды не ў руцэ.
З разумным пагавары – розуму набярэшся, а з дурнем – свой страціш.
Сам харошы, а розуму няма і на два грошы.
Праўда даражэй за грошы.
Прапала кароўка – прападай і вяроўка.
Бярыся дружна – не будзе грузна.
Дружна і горы раўняюць.
З разумнымі дзеткамі і без грошай хораша.
З добрага кораня – добры і сучок.

**Скорагаворкі**

Ехаў Грэка цераз рэку,
Бачыць Грэка: у рэчцы рак.
Сунуў Грэка руку ў рэку,
Рак за руку Грэку – цап.

Стары драч горла драў,

Драчанятак пільнаваў.

Раз прывёз Рыгор Цімоху мех арэхаў, мех гароху.

Тракоп і Барыска елі барбарыскі.

Рыбак Рыгор рыбачыў на рацэ.

У двары - горка, пад горка – норка.

На двары без пары таўкуць мак камары.

Паклікаў Рыгорка Ягорку на горку.

Добра з Рыгоркам на горцы Ягорку.

Ракі, рыба і рака абхітрылі рыбака.

Рагатун Рыгорка родам
З Рагачова – горада.
Як захоча – зарагоча
Рагатлівым рогатам.

Добры ў рэчцы ранкам клёў,
Калі спрытны рыбалоў.

Кропля з кропляй размаўляе.
Кропля кроплю падганяе:
- Ты скачы праз плот,
Абмінай асот!

Прагнуць працы буракі,
Кроп і рэпа і гуркі!

Вавёрка збірала арэхі,
Сабрала арэхаў паўмеха.

Рыгор, Кірыл і Палікарп

Арлу, арлёнку і арліцы

Прыйшлі ў нядзелю ў заапарк.

Пакармілі ў заапарку

Мы жырафу і жырафку.

Выраслі на градцы агуркі,

Рэдзька, морка, буракі.

У гародзе Варвара

Гароху нарвала.

Небарака грак не рад.

Раптам трапіўшы пад град.

На дрэве голым не сядзіцца.

Грымнуў гром угары,

Хлынуў лівень на двары.

У бары брусніцы

Бралі тры сястрыцы.

Ранкам рэпку з градкі рад

Вырваць братка на салат.

Прыляцеў да сябра верабей,

Сябра ў верабейкі – салавей.

СМАЧНЫЯ ІРЫСКІ

Каля горкі

Два Рыгоркі,

Дзве Марынкі,

Дзве Ірынкі,

Два Барыскі,

Дзве Ларыскі

Елі смачныя ірыскі.

| | |
|---|---|
| Адна сарока, адна марока, сорак сарок, сорак марок. | Дзе цётчынаму дзьдзьку дзецца. |
| Гаварыў, гаварыў, не дагаварыў, дагаварыў, дагаворваў, ды загаварыўся. | Дзяды і дзядзькі на дзядзінцы дзялілі дзялянкі. |
| Гарох лапаціцца, чачавіча квохча, мак шуміць. | Дзятлы дзюбамі дзяўблі дзеравіну. |
| Жабрак жабрака жабраваць вучыў. | Жалеза выжалезілася, калясо выкалесілася. |
| Ішоў поп каля коп, каля капы, каля паўкапы. | Каваль каваў каня, конь кавалю капытом, каваль каню калом. |
| Каласы каласавалі, каласавалі, выкаласавалі. | Калясо выкалесілася, жалеза выжалезілася, палукашак выпалукашыкаваўся, агонь выагняваўся. |
| Крывая цяцера просту крывіць. | Каля ямы з кіямі, з кіямі каля ямы. |
| Каму па каму, а каму і два камы. | Капылы перакапылілі, перавыкапылілі. |
| Карл у Клары ўкраў каралі. | Клюйце, куры, крупы каля ступы. |
| Калясо калесавалася, калесавалася, выкалесавалася, перавыкалесавалася. | Лавіў рыбак судака, судак лавіў рыбака: лоўка, рыбак, ловіш – судаку сорам робіш. |

| | |
|---|---|
| Лезь, залезь, залезшы, злезь. | Лянок ня любіць лянот, лынот на любіць лянок. |
| Мы бачылі бабра, і нам сказаў бобра, што нам будзе добра. | На дварэ – трава, на траве – драва. |
| Намётка ў прачкі, сарочка ў швачкі. | Пад вываратнямі вавёрка ўе вяроўкі вёртка. |
| Паслалі сабаку па табаку – ані сабакі, ані табакі. | Пекар Пётр пёк піроґ. |
| Перапілі, пераелі, пералушчылі, перапаролі, перамалолі, ператрушчылі. | Піліп да ліпы прыліп, да ліпы прыліп піліп. |
| Пільшчыкі-пілавальшчыкі пілавалі піламі. | Рапартаваў, рапартаваў, ды не дарапартаваў, стаў дарапартоўваць, ды зарапартаваўся. |
| Руды гарбаты Рыгор гроб грыбы граблямі. | Стругаў, стругаў, не дастругаў, стаў дастругваць – перастругаў. |
| Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне. | Трактарыст, прычапі прыцэп да трактара. |
| Трухлявую дзеравіну дзятлы дзяўбуць дзюбамі. | Тры дрывасекі, тры дрываколы на трох дварах дровы колюць. |
| Тры чарты карчавалі карчы, карчавалі, выкарчоўвалі, панавыкарчоўваліся. | Трыццаць тры дрывасекі трыццаць тры дрывотні надрывасечылі. |

| | |
|---|---|
| Уцякай, цецяручыха, з цецяручанятамі. | Цецяручыха цецяручанятам цеста месіць. |
| Цярпення няма цяпер церці цярніцаю лён. | Чацвер, чацвёртае чысло. |
| Што б я калі дзе што-небудзь якое, а то я ніколі, нідзе, нічога, ніякага. | Я нікому ніколі нічога ніякага, а калі што якое, дык што там такое? |
| Зранку верабей на рынку<br>у прадавачкі скраў разынку,<br>падабраў стручок гароху<br>і арэхаў грэцкіх троху.<br>А сяброўцы на страху<br>курагі прынес крыху… | - Мікіта! Ці ты та?<br>- Не я то, мой та-та.<br>Мікіціха дзяжу месіць,<br>А Мікіта спіну чэшыць.<br>Мікіта дровы сячэць,<br>А Мікіціха бліны пячэць.<br>Сячэць дровы яловыя,<br>Пячэць бліны паловыя. |
| Чацвер, чацвёртае чысло. | Андрэй не дурэй, не дзяры капоты! Не ты ткаў, не ты праў, не твае работы! |
| Чарапаха-чэмпіён<br>Хоча бегчы марафон.<br>Ды, каб часу не губляць,<br>Хоча з фінішу пачаць. | Чэрці ў возеры купаліс,<br>Чэрці рожкамі штурхаліся,<br>Чорт чарцёнка штурхануў<br>І чарцёнак патануў. |
| Каваль каваў каня, конь кавалю капытом, каваль каню калом. | Цярпеньня няма цяпер церці цярніцаю лён. |

| | |
|---|---|
| Коцік шэры ў кватэры<br>Са сцяны садраў шпалеры. | Клюйце, куры, крупы каля ступы. |
| На стале – лямпа, а на столі – лямпачка. | На дыване — канапа,  на канапе – Ян, споўз Ян з канапы на дыван. |
| Чуйныя вушкі, відушчыя вочкі, моцныя ручкі, спрытныя ножкі, цікаўны носік, вясёлы роцік, стройная спінка, падцягнуты жывоцік. (прамаўляем і паказваем) | Скача чапля па балоце, чачотачка ў чароце,<br>А чубаты чачот топча, топча агарод. |
| Б’е баран у барабан, барабаншчык наш баран. | Рыбак Рыгор рыбачыў на рацэ. |
| Лаўрэн лавіў рыбу, Лара варыла рыбу з лаўровым лістом. | Данута і Даніла дзясяты дзень адзначаюць дзень народзінаў. |
| Вадавоз вёз ваду ад вадаправода. | Рабая курка клюе крупкі. |
| Белы бусел баяў байку беламу зайку. | Боб ды боб — два бабы, а яшчэ боб — тры бабы. |
| На двары стары баран грукаў зранку ў барабан. | І тут гу-гу, і там гу-гу, і нічога разабраць не магу. |
| Твая маці і мая маці пяклі булкі ў адной хаце. | Добра ўсюды добраму.<br>Добраму ўсюды добра. |
| З'еў маладзёц трыццаць тры пірагі з пірагом ды ўсе з тварагом. | Ехаў грэка цераз рэку.<br>Бачыць грэка: ў рэчцы рак.<br>Сунуў грэка руку ў рэку,<br>Рак за руку Грэку цап. |
| Маша шыла шапку Сашу.<br>Шапку Сашу шыла Маша. | Саша на шашы, смокчучы сушку, шагам шпарка шпарыла. |
| Ткач ткаў хустку на таху і хукаў | Пабудзе ў вадзе і някокры |

| | |
|---|---|
| на руку. | ідзе. |
| Патап пакаваў пакупнікам пакупкі ў пакункі. | Пракоп і Барыска елі барбарыскі. |
| Смешкі кошцы, слёзкі мышцы. | |
| Раз прывёз Рыгор Цімоху мех арэхаў, мех гароху. | Вадавоз ваду вёз, вёз аваду вадавоз |

*Матэрыял падрыхтаваны з выкарыстаннем інтэрнэт-крыніц*